# Абарона праў спажыўцоў

Пракуратурай раёна прааналізавана прытрымліванне заканадаўства аб абароне праў спажыўцоў на гандлёвых аб'ектах Ашмянскага філіяла Гродзенскага абласнога спажывецкага таварыства.

У адпаведнасці з арт. 5 Закона «Аб абароне праў спажыўцоў» ад 09.01.2002 № 90-З, спажывец мае права на належную якасць тавараў (работ, паслуг), у тым ліку бяспеку тавараў (работ, паслуг), належную камплектнасць, належную колькасць тавару (выніку работы).

У ходзе праведзенага аналізу вызначана, што ў 2018 годзе ГУ «Ашмянскі раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі» неаднаразова выяўляліся парушэнні санітарна-эпідэміялагічнага заканадаўства на гандлёвых аб'ектах Ашмянскага філіяла Гродзенскага абласнога спажывецкага таварыства.

Разам з тым у адпаведнасці з арт.13 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб санітарна-эпідэміялагічным дабрабыце насельніцтва» ад 07.01.2012 № 340-З, санітарныя нормы і правіла абавязковыя для прытрымлівання дзяржаўнымі органамі, іншымі арганізацыямі, фізічнымі асобамі ў тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі.

Парушэнні санітарна-эпідэміялагічнага заканадаўства на гандлёвых аб'ектах у сваю чаргу не дазваляюць належным чынам забяспечыць абарону праў спажыўцоў.

Найбольш небяспечным парушэннем, якое прадстаўляе пагрозу жыццю, здароўю насельніцтва і якія неаднаразова выяўляліся на гандлёвых аб'ектах з'яўляецца рэалізацыя прадуктаў з мінулым тэрмінам прыдатнасці.

Магазін «Родны кут» г. Ашмяны вул. Савецкая, 108, 29.05.2018 і 03.08.2018 выяўлены факты рэалізацыі тавараў з мінулым тэрмінам прыдатнасці. Аналагічныя парушэнні выяўляліся: магазін «Родны кут» г. Ашмяны вул. Борунская, 36, 03.04.2018; магазін «Родны кут» в. Пакрыўцы, 11.04.2018; магазін «Родны кут» аг. Гальшаны, 27.04.2018 і 08.08.2018; магазін «Родны кут» в. Семернікі 04.08.2018 і 05.07.2018; магазін «Родны Кут» в. Маствілішкі 23.03.2018, 11.05.2018 і 19.09.2018; магазін «Родны кут» 25.10.2018, 04.04.2018, 03.05.2018, 20.11.2018.

Трэба адзначыць, што на гандлёвых аб'ектах Ашмянскага філіяла Гродзенскага абласнога спажывецкага таварыства сістэматычна выяўляліся і іншыя парушэнні санітарна-эпідэміялагічнага заканадаўства, якія не дазваляюць забяспечыць абарону праў спажыўцоў.

Так, у Магазіне «Родны кут» г. Ашмяны, вул. Савецкая, 108 20.02.2018 вызначаны факт рэалізацыі прадукцыі без дакументаў, якія сведчаць аб якасці і бяспецы.

У магазіне «Вясёлка» г. Ашмяны, вул. Чырвонаармейская 6, 24.08.2018 да рэалізацыі прапанаваны тавар без маркіроўкі.

Па фактах выяўленых парушэнняў складзена 13 пратаколаў аб адміністрацыйным правапарушэнні на юрыдычную асобу, і 2 пратакола на фізічную асобу. Таксама, у адрас кіраўніка РАЙСТ накіравана 34 рэкамендацыі па ліквідацыі выяўленых парушэнняў.

Жэгздрынь Ягор
Памочнік пракурора
Ашмянскага раёна